*Іна Алексніна*

# ДА ПЫТАННЯ АБ СВЯТКАВАННІ ВЕСНАВЫХ СВЯТАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ ЗАХОДНЯГА ПААЗЕР'Я

Найбольш ярка тэатралізаваныя элементы і варыянты драматызацыі як па ўсёй Беларусі, так і на тэрыторыі Заходняга Паазер'я, выяўляюць сябе ў каляндарных народных святах, абрадах, звычаях. Шэраг знаўцаў народнай творчасці, у тым ліку і Л.М. Салавей [1], гавораць аб сэнсава-рытуальнай блізкасці каляднага і валачобнага абраду, так як яны цесна звязаны са святкаваннямі Новага года і пачатку летазлічэння, толькі па розных каляндарных сістэмах [1, с.6]. Дарэчы, святкаванне Новага года і пачатак летазлічэння з першага зімовага месяца прыйшло да нас у больш позні час, узнікла пасля 46 г. н.э. і было звязана з прыняццем юліянскага каляндара. У Расіі Новы год пачаў адзначацца толькі з другой паловы XVI ст. па афіцыйным загадзе Пятра І. У шэрагу народаў свету пачаткам года была вясна: у рымлян – 1 сакавіка, у іранцаў – 21 ці 22 сакавіка, старажытныя грэкі сустракалі Новы год згодна з месяцавым каляндаром. Валачобная песенная спадчына дастаткова багата адлюстроўвае факт, што беларусы таксама пачыналі новы працоўны год з вясны, з падрыхтоўкі да новага ўраджаю.

З найбольш цікавых свят жыхароў заходняй часткі Паазер'я прысвечаных веснавому сонцавароту, у якіх яўна выяўляюцца элементы тэатралізацыі, можна назваць Масленіцу і Вялікдзень (Вельканоц – у католікаў).

Заўважым, што свята Гукання вясны, пашыранае на астатняй частцы Беларусі, для тэрыторыі заходняй часткі Беларускага Паазер'я не было характэрным. Веснавы святочны цыкл тут распачынаў Масленічны тыдзень. Час ад панядзелка да нядзелі праходзіў весела і шумна, пачыналі працаваць вясновыя кірмашы.

На тэрыторыі дадзенага рэгіёна кірмаш, як значная эканамічна-культурная з'ява, быў вядомы яшчэ з XVII ст. У Глыбокім у гэты час працавалі два рынкі, у Друі Браслаўскага павета яны размяшчаліся у некалькіх частках горада [2, с. 20]. Святочныя гандлі, якія арганізоўваліся ў дні храмавых свят, пад уздзеяннем каталіцкага веравызнання ў Заходняй Беларусі, атрымалі назву «фэсты». Даследчыкі кірмашовай культуры П.А. і Н.І. Гуд [2, с. 32] падкрэслівалі, што на іх адбывалася не толькі набыццё пэўнага тавару. Фэсты былі спрыяльным месцам для адпачынку і рэалізацыі творчых, мастацкіх патрэб у спевах, танцах, гумары, жартах, шматлікіх гульнях і забавах. Акрамя веснавых, праводзіліся юраўскія, міколаўскія, пакроўскія гандлі. Вялікай папулярнасцю карысталіся атракцыёны «Павук» (в.Пераброддзе, Міёршчына), «Прызавы слуп», «Браслаўская рыбалка», «Перабродзская рыбалка», гульні «Цотка ці лішка», «Галаўня», «Фанты» дастаткова пашыраныя на тэрыторыі рэгіёна і апісаныя сучаснымі даследчыкамі П.А. і Н.І. Гуд у кнізе «Беларускі кірмаш» [2]. Акрамя таго, на кірмашах Полацкага павета былі распаўсюджаны своеасаблівыя песенныя і танцавальныя спаборніцтвы паміж жыхарамі суседніх вёсак, хлопцамі і дзяўчатамі. На Браслаўшчыне (вёска Ахрэмаўцы) «… на кірмашах у перапынках паміж танцамі вадзілі карагоды-жарты: чалавек дзесяць седзячы ў коле, спявалі песні, чатыры хлопцы выбіралі дзяўчат, хадзілі з імі па колу, а астатнія падбіралі і прысвячалі прыпеўкі кожнай пары адпаведна асабістым якасцям удзельнікаў» [2, с. 103].

У час масленічнага тыдня аб'язджалі маладых коней, каталіся на ўпрыгожаных вазках, гушкаліся на арэлях. Менавіта на Масленіцу было прынята ўшанаванне жанатай моладзі і жартаўлівае пакаранне тых, хто дасягнуў шлюбнага ўзросту але не стварыў сям'і. Да гэтай нагоды рыхтавалі «калодкі» (у некаторых мясцовасцях «лялькі», «стужкі», у старавераў –«біркі»). У рэгіёне не зафіксавана абраду «разування маладой», але «калодкі» чаплялі амаль у кожнай мясцовасці. Згодна апісанням інфарматараў Т.А. і Г.А. Крывель і А.І. Кулікоўскага з вёсак Мурмішкі і Заборнікі Браслаўскага раёна, гэта падзея адбывалася наступным чынам. Зранку ездзілі на ўпрыгожаных вазках і лавілі нежанатага хлопца. Пыталіся, чаму той не жаніўся, а пасля вешалі яму на шыю «калодку» і пачыналі танцаваць вакол яго, утварыўшы кола. Хлопец павінен быў чым-небудзь адкупіцца ад «калоднікаў». У большасці сваёй «выкуп» адбываўся пасля выканання якога-небудзь творчага задання [3].

Не абыходзілі ўвагай і незамужніх дзяўчат. Для іх рабілі з сена падушкі, клалі на вазок і садзілі на яе дзяўчыну. Пасля чаго ездзілі па вёсцы і ўсяляк расхвальвалі яе гаспадарлівасць і прыгажосць. Тэксты мелі імправізацыйны характар, выкарыстоўвалася багацце спеўнай спадчыны [3].

У жыхароў-старавераў быў звычай незаўважна чапляць «біркі» на спіну, што выклікала смех, незласлівыя кпіны ў прысутных. У некаторых мясцовасцях стараабрадцы «цягалі калоду». Для гэтага хлопца або дзяўчыну запрагалі ў яе і імкнуліся дабіцца выкупу ад іх. Акрамя таго, на Масленіцу пад час катання на конях або на кірмашы хлопцы-староверы выбіралі сабе жонак і выкрадалі іх. Пасля гэтага вяселле маглі і не спраўляць, таму што дзяўчына, якая правяла ноч у хаце хлопца, аўтаматычна лічылася яго жонкай (вёскі Нова-Пагост на Міёршчыне і Бяльдзюгі Шаркаўшчынскага раёна).

Але і свята Масленіцы было характэрным не для ўсёй часткі Заходняга Паазер'я. Напрыклад, у вёсках Казлы і Чэрасы на Міёршчыне яго ўвогуле не адзначалі.

З асаблівай урачыстасцю ў рэгіёне святкавалі Вялікадзень. Звычайна ён прыпадае на першую нядзелю пасля веснавога раўнадзенства і поўні. Пашыраным у святочныя вечары было велікоднае вандраванне валачобнікаў, якое, на думку даследчыка міфалогіі і абрадавасці валачобных песен Н.М.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Нікольскага «... ёсць толькі бедная, сцёртая рэштка ранейшай, больш багатай, драматычнай абраднасці» [4, с. 260]. Мастацтвазнаўца М. Каладзінскі схільны лічыць валачобнікаў непасрэднымі прадаўжальнікамі традыцый скамарохаў [5, с. 69].

Гэты веснавы абрад напамінае зімовыя абходы калядоўшчыкаў функцыянальнай блізкасцю і сюжэтным падабенствам песен-віншаванняў, сходным кантэкстам святкаванняў. У язычніцкія часы абрады мелі магічны характар, былі накіраваныя на павышэнне ўрадлівасці, ушанаванне, ўслаўленне працаўніка-гаспадара, яго чалавечых і гаспадарчых якасцей, апаэтызаванне яго маёмаснага становішча, пажаданне здароў'я і дабрабыту сям'і. У мясцовасцях, дзе атрымала пашырэнне валачобніцтва, калядны абрад амаль не сустракаецца. І наадварот.

Абрад, які атрымаў назву валачобнага, быў распаўсюджаны сярод асоб праваслаўнага і каталіцкага веравызнаня, а для стараавераў зусім не характэрны. Заўважым, што ў адрозненне ад іншых рэгіёнаў Беларусі, дзе бытавала валачобніцтва, у Заходнім Паазер'і найчасцей яно называецца «лалоўніцтвам» (вёскі Стаўрава Браслаўскага раёна, Васіліны, Лынтупы Пастаўскага раёна, Малыя Алашкі Міёрскага раёна і інш.). Католікі вёскі Магуны Пастаўскага раёна «ішлі ў алялюю». Адметнымі лакальнымі рысамі надзелены валачобны абрад і адпаведная песенная спадчына Міёршчыны. У вёсках Бабышкі, Латышы, Лявонполе гаварылі: «Трэба ісці ў Хрыстос» і песні адпаведна называліся «хрыстоснымі». На тэрыторыі Міёршчыны С. Панізнікам зафіксаваны тры разнавіднасці «Хрыстосаў» – каталіцкі, праваслаўны і сякаўскі. «… Сякамі называлі плытагонаў з-пад Смаленска, дзе беларусы «сыкалі», вымаўлялі, напрыклад, «цыгунок» замест «чыгунок». Яны вясною сплаўлялі свае ганкі-платы і на Вялікдзень прыставалі да лявонпальскага берага Дзвіны, каб за песні атрымаць «ганарар» – скаромнае. І песні іх былі хуткімі. І запевак кароткі: «Хрыстос – сын божы». Бо ў іх сапраўды не было часу: беларускую драўніну … чакала ў Рызе Еўропа» [6, с.3].

Жыхары рэгіёна «лалоўнічалі» або «хрыстоснічалі» пераважна ў першы вечар свята. Толькі ў вёсцы Малыя Алашкі абхадзілі аднавяскоўцаў днём [7]. Рознымі па складу і колькасці ўдзельнікаў былі гурты. Аднак найчасцей «лалоўнічалі» нежанатыя хлопцы і мужчыны. У вёсках Сакуны і Васіліны на Пастаўшчыне абрад валачобніцтва пачыналі хлопчыкі, якія першы абход вёскі рабілі на змярканні [7]. У іншых мясцовасцях рэгіёна (напрыклад у вёсцы Магуны на Пастаўшчыне) дзеці хадзілі «у жачыкі» (па святочныя яйкі) на другі дзень свята [8]. У вёсцы Дрысвяты Браслаўскага раёна абход хат дзецьмі практыкаваўся толькі праз тыдзень і насіў назву «дзіцячы Вялікдзень» [9]. У вялікіх паселішчах колькасць гуртоў не абмяжоўвалася; напрыклад, у тых жа Магунах, за вечар магло хадзіць шэсць-сем груп [7]. Найчасцей выкананне «хрыстосных» песень суправаджалася гармонікам, пры наяўнасці – скрыпкай або (і) цымбаламі [7].

Галоўную ролю ў лалоўнымным абрадзе выконваў «пачынальнік», якога выбіралі загадзя. Ён быў своеасаблівым распарадчыкам веснавога абходу, галоўным выканальнікам усіх песен. Астатнія ж удзельнікі падхоплівалі аднарадковыя «запеўкі», якія паўтараліся пасля кожнага радка. Таму для выканання ролі «пачынальніка» выбіралі чалавека сталага, які добра ведаў валачобную спадчыну, меў здольнасці да спеваў і імправізацыі. Акрамя таго, спецыфіка валачобных песень патрабавала ад выканаўцы добрай памяці, увагі, засяроджанасці, сканцэнтраванасці на змесце і дакладнай паслядоўнасці пераліку свят і прысвяткаў. Першапачаткова гэта было звязана з верай у сілу аграрна-магічнага ўздзеяння валачобнага абраду. І калі парушылася ўстаноўленая тэкставая традыцыя, лічылася, што гэта магло наклікаць на двор гаспадара ці яго сям'ю няшчасце. Шматгадовы выканаўца ролі «пачынальніка» з Міёршчыны Андрыян Кісляк мог выканаць толькі сем «хрыстосаў» у суткі – на большае не хапала энергіі [6, с.3].

У адрозненне ад іншых рэгіёнаў Беларусі, на тэрыторыі Заходняга Паазер'я, пад моцным каталіцкім уплывам назіраецца больш рэлігійная змястоўнасць тэкстаў, традыцыйнае выкананне. Адсюль і адсутнасць пераапранання, пераўвасаблення ў розныя вобразы, якія бытавалі ў іншых рэгіёнах Беларусі [5, с 72], тым не менш, наведванне кожнай вясковай хаты патрабавала і своеасаблівай выканальніцкай імправізацыі. У песнях велічалі не толькі Бога, Божую маці, шэраг "святцаў", але і гаспадара, гаспадыню, іх сям'ю, шчырую працу, «дварок-раёк». Змест песень змяняўся ў залежнасці ад складу слухачоў. Спецыяльныя песні спявалі сыну і дачцэ, якія дасягнулі шлюбнага ўзросту.

Пасля абходаў вёскі, а часам і суседніх паселішчаў, лалоўнікі збіраліся са «скаромным» у адну вялікую хату, дзе ладзілі гулянне да першых пеўняў. На гэтых «начнічках» частаваліся, танцавалі, вадзілі карагоды, гулялі ў розныя гульні (пераважна з велікоднымі яйкамі).

Такім чынам, найбольш блізкім да тэатралізацыі з усіх веснавых свят на тэрыторыі Заходняга Паазер'я з'яўляецца валачобны абрад. Галоўнымі адметнымі яго рысамі на разглядаемай на тэрыторыі з'яўляюцца шырокае і доўгачасовае бытаванне ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі Беларусі (Усходняе і Цэнтральнае Паазер'е і Цэнтральная частка Беларусі, дзе ў савецкія часы абрад паступова вымірае). Становішча «тэрытарыяльнай правінцыі», у якой значную ролю адыгрывала рэлігія і веравызнанне жыхароў, спрыяла захаванню яго і па сённяшні дзень. Безумоўна, што праваслаўе і каталіцызм аказалі значны ўплыў на тэксталогію песеннай спадчыны лалоўніцтва, якая, тым не менш, не страціла сваёй практычнай і мастацка-эстэтычнай значнасці. Пацвярджэннем таму служыць факт даўгачасовага бытавання звычаю «лалоўніцтва», «хаджэння ў Хрыстос», «алялюю», які не толькі падтрымліваецца духавенствам (прычым не толькі праваслаўным, але і каталіцкім), але і захоўваецца сярод веруючых (асабліва на Міёршчыне), а таксама займае цэнтральнае месца ў святах веснавога сонцастаяння жыхароў Заходняга Паазер'я.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Спіс літаратуры:**


1. Салавей, Л.М. Валачобныя песні / Л.М. Салавей // Валачобныя песні. – Мінск : Навука і тэхніка, 1980. – С. 5–36.
2. Гуд, П.А. Беларускі кірмаш / П.А. Гуд, Н.І. Гуд. – Мінск : Полымя, 1996. – 270 с.
3. Масленіца, чаплянне «калодкі» – запісала А.Р. Котава ў 1997 г. у в. Вайнюнцы Браслаўскага раёна ад Т.А. Крывель (1923 г.н.), Г.І. Крывель (1921 г.н., в. Заборнікі) і А.І. Кулікоўскага (1921 г.н., в. Мурмішкі Браслаўскага раёна).
4. Нікольскі, Н.М. Міталогія і абрадавасць валачобных песень: з прац секцыі этнаграфіі / Н.М. Нікольскі ; НАН Беларусі, Ін-т гіст. навук. – Мінск : Б. в., 1931. – 362 с.
5. Гісторыя беларускага тэатра : у 3 т. / гал. рэд. У.І. Няфёд. – Мінск : Навука і тэхніка, 1983. – Т.1 : Беларускі тэатр ад вытокаў да кастрычніка 1917 года. – 496 с.
6. Панізнік, С. Масці кладку, заві ў хатку / С. Панізнік // Сцяг працы. – 1992. – 25 крас. – С. 3.
7. Вялікдзень, Купалле, «Тры каралі», «Яшчур» – запісала Т. Гарошка ў 1992 г. у г.п. Лынтупы, в. Сакуны, Васіліны Пастаўскага раёна. Інфарматары: Г.А. Собаль (1914 г.н., в. Заброддзе); К.М. Вароўка (1916 г.н., в. Забродзе); Г.У. Грынько (1916 г.н., в. Камаі); Г.Б. Пяткевіч (1914 г.н., в. Сакуны); А.В. Гутар (в.Шыркі), Г.П. Танана (г.п. Паставы).
8. Вялікдзень, «жачыкі» – запісала Т. Гарошка ў 1992 г. у в. Магуны Пастаўскага раёна ад І.Ф. Якяна (1942 г.н.). «Дзяцічы Вялікдзень» – запісала Э.Л. Шавэло ў 1998 г. у в. Дрысвяты Браслаўскага раёна ад Т.Г. Пяткевіч (1928 г.н.).


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ